www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

27 верасня 2005 года, № 16 (1924)

## БДУ-NEWS

### АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

У актавай зале ліцэя БДУ 3 кастрычніка адбудзецца пашыранае пасяджэнне Вучонага савета нашага універсітэта. Асноўная тэма — "Вынікі работы БДУ ў 2004—2005 навучальным годзе і задачы па ўдасканаленні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у 2005—2006 навучальным годзе". Пачатак у 10 гадзін.

### ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН СВЯТКУЕ 10-ГОДДЗЕ

Урачыстыя мерапрыемствы праходзяць з 26 верасня па 1 кастрычніка. У праграме святкавання запланавана спартакіяда ФМА з удзелам студэнцкіх і выкладчыцкіх каманд, навуковая канферэнцыя "Беларусь у сучасным свеце" і VI Дыпламатычныя чытанні ФМА, конкурсы на найлепшую насценгазету і плакаты і інш. 30 верасня ў канцэртнай зале "Мінск" адбудзецца пашыранае пасяджэнне Вучонага савета ФМА, прысвечанае юбілею.

### НАЙЛЕПШАЯ НАВУКОВАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ БДУ

У адпаведнасці з Палажэннем аб конкурсе на найлепшыя навуковыя работы студэнтаў, зацверджаным загадам па БДУ ад 21.09.2005 г. №321-ОД, абвяшчаецца конкурс на прысуджэнне прэмій за найлепшыя навуковыя работы студэнтаў — адну ў галіне сацыяльных і гуманітарных і адну ў галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук.

Дакументы прадастаўляюцца да 10 кастрычніка 2005 г. у аддзел НДРС (тэл. 209-54-27, пакой 418, вул. Бабруйская, 9) з 14 да 16 гадзін штодня. На конкурс прадстаўляюцца работы асобных аўтараў, у некаторых выпадках допускаюцца два аўтары. У конкурсе могуць удзельнічаць выпускнікі 2005 г.

Інфармацыю па конкурсе можна атрымаць у адказных за НДРС на факультэтах альбо пазнаёміцца з ёй на сайце аддзела (http://nirs.bsu/ ).

Наяўнасць публікацый канкурсантаў абавязковая.

**Камісія**

---

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# МІНЧАНІН ГОДА ПРАЦУЕ Ў БДУ

10 верасня Мінск адзначыў свой 938-ы дзень нараджэння. Святочныя мерапрыемствы пачаліся ля гарадской ратушы. Напачатку ўсіх весяліла фольк-медыя-група "Неруш", якая падаравала прэм'ерай песні "Дажыначкі". Затым мінчане і госці сталіцы апынуліся ў атмасферы сярэдневечча, якую ўзнаўлялі спецыяльна падабраныя музыка, танцы і касцюмы. Нават на галерэі ратушы сабраліся пяцёра рыцараў і прыгожая дама. Усё гэта было уверцюрай да цырымоніі адкрыцця святочных мерапрыемстваў і ўзнагароджання пераможцаў агляду-конкурсу "Мінчанін-2005".

Мэр Міхаіл Паўлаў павіншаваў мінчан: "Толькі што мы аддалі даніну памяці тых, хто абараняў горад у часы апошняй вайны". Словы "Мой Мінск, у сэрцы ты адзіны" ён абвясціў дэвізам свята. Старшыня гарвыканкама сам уручыў кожнаму пераможцу конкурсу "Мінчанін года" нагрудны знак, дыплом і грашовую прэмію (510 тыс. руб.).

Найлепшым мінчанінам 2005 г. у галіне вышэйшай адукацыі і навукі прызнаны дацэнт кафедры агульнай фізікі БДУ **Міхаіл Аляксандравіч Сянюк**. Акрамя выкладчыцкай дзейнасці на фізічным факультэце БДУ, ён яшчэ працуе ў школе № 51, дзе рыхтуе юных фізікаў да ўдзелу ў алімпіядах. Сярод яго гадаванцаў — чэмпіён свету ў першынстве па фізіцы Аляксандр Міхалычаў (студэнт II курса фізфака), больш за 100 пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд, 11 прызёраў міжнародных спаборніцтваў. Такім чынам, Міхаіл Аляксандравіч гадуе эліту студэнцкай моладзі, будучую надзею беларускай навукі.

Аб сваёй працы кажа так: "Кожны павінны займацца той справай, да якой душа ляжыць. У нас з навучэнцамі вельмі цёплыя адносіны: трэба, каб мы давяралі адно аднаму, інакш немагчыма разам займацца навукай".

Міхаілу Аляксандравічу 50 год, 9 з іх ён выкладае ў 51-й школе, і каля 25 — на фізфаку.

— У школе выкладаць нават больш цікава: адразу бачыш вынік. Ва універсітэце няма элементу спаборніцтва: студэнты, нават здольныя, часта становяцца сераднякамі. Іх цікавяць адзнака на экзамене, стыпендыя і дыплом. Вось чытаю я, напрыклад, курс оптыкі, аднолькавы і для універсітэта, і для 10-га класа (гэта робіцца дзеля таго, каб школьнікі былі канкурэнтаздольнымі на алімпіядах). Студэнты асабліва не цікавяцца: ім бы зарабіць сваю 9 ці 10, а вось алімпіяднікі... У іх сапраўдны запал! Прыемна бачыць, як яны растуць на вачах. Не толькі як фізікі, але і як асобы. Была ў нас такая сітуацыя, што ў аднаго хлопца з каманды не аказалася патрэбнага штампа ў пашпарце для выезда за мяжу, і яго замянілі. А калі камандзе спатрэбілася дапамога, ён, седзячы ў Мінску, усю ноч дапрацоўваў пэўную задачу, пераслаў нам гатовы матэрыял па электроннай пошце, і на спаборніцтвах мы былі ў поўным узбраенні.

Цікава, што ў камандзе педагогаў, што рыхтуюць юнакоў і дзяўчат да спаборніцтваў, шасцёра студэнтаў — былых алімпіяднікаў. "Ім школьнікі больш давяраюць. Яны нібы размаўляюць на адной мове", — кажа Міхаіл Аляксандравіч.

Міхаіл Аляксандравіч апантаны сваёй справай, ён шчыра шкадаваў, што з-за цырымоніі ўручэння прэміі прапала некалькі ўрокаў. На маё пытанне аб планах на будучыню адказаў:

— Стварыць як мага больш цэнтраў па падрыхтоўцы здольных падлеткаў. На сённяшні дзень такія існуюць толькі на базе ліцэя БДУ, 51-й школы, віцебскага ліцэя № 1, гродзенскай гімназіі № 3, гомельскага і магілёўскага ліцэяў. Зараз ёсць напрацоўкі для таго, каб стварыць аналагічныя цэнтры пры 165-й і 171-й мінскіх школах. Безумоўна, гэта можна зрабіць толькі там, дзе ёсць зацікаўленыя педагогі. Каштоўнасць такіх цэнтраў відавочна: адпадзе патрэба ў рэпетытарстве. Бацькам не давядзецца плаціць грошы там, дзе настаўнікі могуць проста выконваць сваю работу.



Пажадаем поспехаў Міхаілу Сенюку ў ажыццяўленні планаў, бо менавіта на такіх адданых сваёй справе спецыялістах і трымаецца сістэма адукацыі.

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фота Марыі КАСЦЮКОВІЧ**

---

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Спаборніцтвы для праграмістаў

***Студэнты і выпускнікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі ў гэтую восень дабіліся высокіх вынікаў, выступаючы на спаборніцтвах TopCoder.***

Так, Іван Мяцельскі (IV курс ФПМІ) стаў найлепшым праграмістам месяца на TopCoder (за жнівень яго рэйтынг вырас амаль на 300 пунктаў). Разам з Іванам Заўгародним (магістрантам ФПМІ) яны прайшлі ў фінал і будуць змагацца за ўзнагароды з яшчэ 46 фіналістамі 13—14 кастрычніка ў г. Санта-Клара (ЗША). Сёлетні выпускнік ФПМІ Аляксей Кіркоўскі прайшоў у фінал спонсарскага конкурсу "Google Code Jam 2005" і змагаўся за перамогу ў Каліфорніі 23 верасня.

Што ж такое TopCoder? www.topcoder.com — гэта партал для тых, хто цікавіцца праграмаваннем і каму ўжо споўнілася 18 гадоў. Два разы на тыдзень TopCoder праз Інтэрнэт ладзіць конкурсы. Асобныя конкурсы праводзяцца для тых, хто любіць рашаць алгарытмічныя задачы, і для тых, хто распрацоўвае праграмныя кампаненты. Першая частка конкурсаў падобная да алімпіяд па інфарматыцы і праграміраванні. Звычайна на тур даецца 3 задачы рознага ўзроўню складанасці. Вядзецца пастаянны ўлік рэйтынгу ўдзельнікаў па выніках іх выступаў.

Таксама праводзяцца два буйныя шматэтапныя конкурсы: для ўсіх — TopCoder Open, а для студэнтаў ВНУ — TopCoder Collegiate Challenge. Кожны конкурс доўжыцца звычайна 10 тыдняў. Спонсарамі іх з'яўляюцца буйныя сусветныя кампаніі, якія займаюцца распрацоўкай праграмнага забеспячэння. Кожны конкурс ладзіцца ў некалькі этапаў online-спаборніцтваў, праз сіта якіх праходзяць найбольш таленавітыя ўдзельнікі. Пераможцаў (40—100 чалавек) запрашаюць за кошт спонсараў на вочны фінальны турнір. Такія турніры ўжо адбываліся ў Масачусетсе, Санта-Клары, Бостане, Кембрыджы і інш.

**К.В. ПАЗЮРА, старшы выкладчык кафедры тэхналогіі праграміравання, дырэктар Заходняга рэгіёну (Беларусь і краіны Балтыі) камандных чэмпіянату свету па праграміраванні**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ Ў БДУ

У гэтым годзе пераменаў у прыёмнай кампаніі было амаль столькі ж, як і ў мінулым. Новыя тэрміны правядзення ўступных іспытаў, два ўступныя іспыты ў выглядзе цэнтралізаванага тэсціравання, асаблівасці пазаконкурснага залічэння і інш.

Што датычыцца уласна прыёмнай кампаніі ў БДУ, дык сёлета ў адпаведнасці з "Правіламі прыёму ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, на 2005 год" для ВНУ першай плыні былі вызначаны даволі працяглыя тэрміны прыёму дакументаў ад паступаючых на дзённую бюджэтную форму навучання — з 1 па 15 ліпеня. Але калі ўлічыць, што абітурыенты маглі атрымаць сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання па асобных прадметах толькі 12 ліпеня, дык зразумела, што ў апошнія тры дні ў прыёмнай камісіі павінен быць "аншлаг". Так яно і атрымалася.

Паколькі ў гэтым годзе абітурыенты на дзённую форму павінны былі прадаставіць у прыёмную камісію два сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання і здаваць у БДУ толькі трэці экзамен, усяго 4 дні было адведзена для правядзення ўступных выпрабаванняў, якія праходзілі 17—20 ліпеня. А тыя абітурыенты, хто паступаў на скарочаны тэрмін навучання, у гэтыя ж тэрміны былі вымушаны здаваць тры іспыты. Залічэнне ў склад студэнтаў на дзённае бюджэтнае навучанне ажыццяўлялася па 22 ліпеня; прыём дакументаў для ўдзелу ў конкурсе на залічэнне на платнае навучанне — па 2 жніўня; з 3 па 9 жніўня — залічэнне на платнае навучанне.

А вось на завочную і дыстанцыйную формы навучання прыём дакументаў быў вызначаны з 1 па 12 жніўня, а уступныя выпрабаванні — з 14 па 19 жніўня. Прытым абітурыенты, якія паступалі на завочную форму, мелі магчымасць здаваць усе экзамены ў БДУ або прадаставіць сертыфікаты ці па ўсіх іспытах, ці па некаторых з іх. Залічэнне ў склад студэнтаў на бюджэтнае навучанне ажыццяўлялася па 21 жніўня, залічэнне на платнае навучанне — па 23 жніўня.

Такім чынам, прыёмная кампанія расцягнулася практычна на ўсё лета. Такія тэрміны правядзення прыёму на I курс вымусілі многіх супрацоўнікаў БДУ застацца без адпачынку. Акрамя гэтага, прыйшлося двойчы збіраць прадметныя экзаменацыйныя камісіі для правядзення ўступных выпрабаванняў.

Сёлета жадаючых паступіць у БДУ было практычна столькі ж, як і летась. Адпачываць прыёмнай камісіі не даводзілася. Супрацоўнікі сакратарыята працавалі ў літаральным сэнсе круглыя суткі.

У 2005 г. набор у БДУ ажыццяўлялі 16 факультэтаў і 3 інстытуты па больш чым 90 спецыяльнасцях, напрамках і спецыялізацыях. У прыёме дакументаў былі задзейнічаны больш за 180 супрацоўнікаў тэхнічнага сакратарыята. Для павелічэння эфектыўнасці працэсу прыёму дакументаў была створана грамадская прыёмная камісія са студэнтаў універсітэта, якія прайшлі спецыяльную падрыхтоўку. Каля 100 студэнтаў дапамагалі абітурыентам запаўняць неабходныя дакументы.

Для эфектыўнай абароны экзаменацыйных лістоў ад падробкі ў гэтым годзе ў БДУ праводзілася лічбавае фатаграфаванне з адначасовым уключэннем лічбавага фота абітурыента ў электронную базу "Абітурыент". Акрамя таго, што практычна была выключана магчымасць падробкі экзаменацыйнага ліста, наяўнасць лічбавага фота ў асобных выпадках дапамагала правесці ідэнтыфікацыю асобы і вырашыць пытанні допуску да экзаменаў. Больш таго, гэтае фота будзе выкарыстана для падрыхтоўкі студэнцкага білета і заліковай кніжкі тых, хто стаў студэнтам БДУ.

Далёка не ўсе абітурыенты і іх бацькі змаглі дакладна разабрацца са шматлікімі новаўвядзеннямі ў правілы ўступных экзаменаў. Вядома, гэта вяло да лішніх хваляванняў. На працягу ўсёй прыёмнай кампаніі ва універсітэцкім гарадку дзяжурыла медыцынская служба, якая пры неабходнасці аператыўна аказвала дапамогу абітурыентам. Псіхалагічную дапамогу абітурыентам пастаянна аказвалі работнікі сакратарыята, супакойваючы і дапамагаючы разабрацца ў сітуацыі. Вырашыць незразумелыя пытанні ў адпаведнасці з заканадаўствам і атрымаць дапамогу ў прыняцці рашэння у канкрэтнай сітуацыі абітурыенты маглі ў юрыста прыёмнай камісіі БДУ.



Для правядзення ўступных экзаменаў былі арганізаваны 13 прадметных экзаменацыйных камісій, куды ўвайшлі больш за 200 найбольш вопытных выкладчыкаў універсітэта.

Дзяржаўную камісію па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных экзаменаў узначальваў старшыня ВАК Рэспублікі Беларусь А.М. Рубінаў. У склад прадметных экзаменацыйных камісій былі ўведзены члены рэзервовых экзаменацыйных камісій, сфарміраваных з настаўнікаў школ, гімназій, ліцэяў.

У адпаведнасці з "Правіламі прыёму ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, на 2005 год" конкурс на дзённае навучанне вызначаўся па выніках трох экзаменаў, два з якіх (руская ці беларуская мова і адзін з профільных) праводзіліся ў форме цэнтралізаванага тэсціравання. Па гэтых экзаменах абітурыент павінен быў прадставіць у БДУ сертыфікат цэнтралізаванага тэсціравання. Трэці экзамен абітурыенты маглі здаваць у ВНУ ці таксама маглі прадставіць сертыфікат (калі гэта дазвалялася Парадкам прыёму ў БДУ).

Асаблівасцю гэтай уступнай кампаніі ў БДУ было яшчэ і тое, што ўступныя выпрабаванні маглі праводзіцца ў выглядзе вуснага або пісьмовага экзамена ці пісьмовага тэсціравання. У сувязі з гэтым на розных спецыяльнасцях былі розныя сістэмы адзнак (10-бальная і 100-бальная) і, адпаведна, конкурс праводзіўся па 10-бальнай ці па 100-бальнай шкале.

Акрамя таго, на ўсе спецыяльнасці трох факультэтаў — міжнародных адносін, юрыдычнага і эканамічнага, а таксама на шэраг спецыяльнасцей факультэта філасофіі і сацыяльных навук, гуманітарнага і ваеннага факультэтаў і інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій і Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій трэці экзамен па матэматыцы, замежным мовам і прадмеце «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» ў БДУ праводзіўся ў форме пісьмовага тэсціравання Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў 17 ліпеня. Удзел у тэсціраванні прынялі: па прадмеце «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» — 1647 абітурыентаў, па матэматыцы — 294, па замежнай мове (англійская, нямецкая) — 99.

Асаблівая сітуацыя ў гэтым годзе магла скласціся на спецыяльнасцях факультэта міжнародных адносін, нягледзячы на тое, што сёлета пазаконкурсны прыём на спецыяльнасці, на якіх у 2004 г. конкурс склаў 5 чалавек на месца і болей, не ажыццяўляўся. Магчымасць яе ўзнікнення кіраўніцтва факультэта і універсітэта прагназавала яшчэ ў красавіку, калі стала вядома колькасць пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд па профільных прадметах. А пасля правядзення "Дзён адкрытых дзвярэй" магчымасць таго, што на некаторых спецыяльнасцях можа ўзнікнуць сітуацыя, калі абітурыентаў, якія маюць права быць залічанымі без уступных выпрабаванняў, будзе больш, чым выдзеленых бюджэтных месцаў, стала амаль стопрацэнтнай. Таму па ўзгадненні з Камітэтам дзяржаўнага кантролю Міністэрства адукацыі перад пачаткам прыёму дакументаў прынята рашэнне абмежаваць магчымасць паступаць на факультэт міжнародных адносін без экзаменаў. Такая магчымасць была прадастаўлена пераможцам алімпіяд толькі па адным азначаным профільным прадмеце.

Мэтазгодна было б надалей вызначыць для кожнай спецыяльнасці толькі адзін профільны іспыт, па якім пераможцы адпаведных прадметных алімпіяд маглі б залічвацца ў ВНУ без экзаменаў. А на некаторых спецыяльнасцях, напрыклад "міжнародныя адносіны", "правазнаўства" і інш., можа, зусім яго не вызначаць.

На дзённую форму навучання ў БДУ ў 2005 г. было пададзена 7909 заяваў на 2006 планавых месцаў, на завочную — 1150 заяваў на 450 месцаў. Сярэдні конкурс па універсітэце на дзённую форму навучання склаў амаль 4 чалавекі на месца, на завочную форму — больш за 2,5. На некаторых спецыяльнасцях: біялогія (напрамак "біятэхналогія"), біяэкалогія, сучасныя замежныя мовы (спецыялізацыя "пераклад"), менеджмент (спецыялізацыя "кіраванне персаналам") і інш. — конкурс склаў болей за 10 чалавек на месца. Але лідэрам у гэтым годзе з'яўляецца спецыяльнасць "дызайн" (напрамак "дызайн прадметна-прасторавых комплексаў") — 18,5 чалавека на месца.

Нечакана высокім выявіўся конкурс на спецыяльнасці факультэта філасофіі і сацыяльных навук. Калі конкурс на спецыяльнасць "псіхалогія" традыцыйна высокі, дык 8—10 чалавек на месца — конкурс незвычайны для спецыяльнасцей "філасофія" і "сацыялогія". Высокі конкурс быў для выпускнікоў юрыдычнага каледжа, якія паступалі на спецыяльнасць "правазнаўства" юрыдычнага факультэта (амаль 13 чалавек на месца). У мінулым годзе ўпершыню быў зроблены набор на спецыяльнасць "бізнес-адміністраванне". А сёлета конкурс на гэтую спецыяльнасць склаў больш за 8 чалавек на месца.

У гэтым годзе абітурыентам было крыху лягчэй вызначыцца наконт выбару: падаваць ці не падаваць дакументы і які шанец паступіць. Прыёмная камісія штодня вывешвала інфармацыю па ўсіх спецыяльнасцях: якая сума балаў набрана па сертыфікатах, пададзеных абітурыентамі (пры ўмове, што абітурыент падаў 2 або 3 сертыфікаты). Аднак абсалютнай пэўнасці гэта не давала, бо невядомымі заставаліся вынікі ўступных экзаменаў.

У прыёмную камісію 759 абітурыентаў падалі па 3 сертыфікаты. Ім трэба было толькі чакаць вынікаў уступных экзаменаў для вызначэння прахаднога бала. Студэнтамі БДУ з іх сталі 189 чалавек. Трэці ўступны іспыт у БДУ здавалі 6655 абітурыентаў, з якіх вытрымалі яго 6401.

З амаль 400 пераможцаў рэспубліканскіх прадметных алімпіяд і алімпіяд "Абітурыент БДУ — 2005" у БДУ на розныя спецыяльнасці залічаны 273 чалавекі.

У бягучым годзе выпускнікі вясковых школ паступалі паводле асобнага конкурсу. У прыёмную камісію паступіла 992 заявы ад выпускнікоў вясковых школ. У 2005 г. на бюджэтную форму навучання ў БДУ паступілі 253 выпускнікі вясковых школ (12,6 % ад плана прыёму).

Колькасць абітурыентаў-мінчан, якія падалі заявы на бюджэтную дзённую форму навучання, — 2804, іншагародніх — 5105; з іх паступіла 777 мінчан і 1229 іншагародніх.

Самы высокі прахадны бал па 100-бальнай сістэме быў вызначаны на спецыяльнасці "менеджмент" (спецыялізацыя "менеджмент у сферы міжнароднага турызму") факультэта міжнародных адносін — 268 для гарадскіх і 258 для вясковых абітурыентаў, а па 10-бальнай – на спецыяльнасці "рамана-германская (нямецкая) філалогія" — 26 (аднолькавы для гарадскіх і вясковых). На спецыяльнасці "рамана-германская (англійская) філалогія" для гарадскіх прахадны бал таксама склаў 26, а вось для вясковых — 23.

Выкарыстанне 100-бальнай сістэмы адзнак на спецыяльнасцях, на якіх уступныя выпрабаванні праводзіліся ў форме тэсціравання, прывяло да таго, што паўпрахаднога бала на гэтых спецыяльнасцях практычна не было. А вось для тых спецыяльнасцей, дзе ўжывалася 10-бальная сістэма адзнак, даволі вялікая колькасць абітурыентаў набрала паўпрахадны бал.

У адпаведнасці з правіламі пры аднолькавай колькасці набраных балаў уступалі ў сілу іншыя ўмовы, сярод якіх апошнім ішоў бал сертыфіката па другім профільным прадмеце. Паколькі асноўны профільны экзамен праводзіўся ў БДУ і таму па гэтым экзамене сертыфіката быць не магло, пры аднолькавай колькасці набраных балаў залічвалі не таго абітурыента, у якога быў большы бал па першым профільным іспыце, а таго, у каго большы бал сертыфіката па другім профільным іспыце. Чаму на фізічны факультэт трэба залічваць па выніках матэматыкі, а не фізікі? І ўжо зусім незразумелым з'яўляецца, калі, напрыклад, на спецыяльнасць "рамана-германская філалогія" залічваецца не той, хто набраў большы бал на экзамене па замежнай мове, а той, у каго ў сертыфікаце большы бал па гісторыі Беларусі; або на спецыяльнасць "дызайн" — не па выніку экзамена па "творчасці (малюнак і кампазіцыя)", а па гісторыі Беларусі.

Нягледзячы на ўсё больш разнастайныя метады атрымання несанкцыянаванай інфармацыі на экзамене (пейджары, мабільныя тэлефоны і інш.), уступныя экзамены прайшлі без эксцэсаў і ў працоўнай атмасферы.

З улікам сітуацыі (вялікі конкурс, неймаверная колькасць дзяўчат і хлопцаў, якія імкнуліся вучыцца ў БДУ) для таго, каб даць магчымасць абітурыентам навучацца на абраных факультэтах, хай сабе і за грошы, кіраўніцтва БДУ прыняло рашэнне пра павелічэнне плана набору на платную форму навучання. Аднак не ўсе жадаючыя патрапілі нават на платнае навучанне: на дзённую форму паводле конкурсу было залічана 1950 чалавек, на завочную, дыстанцыйную — больш за 700.

У цэлым варта адзначыць, што прыёмная кампанія ў БДУ прайшла паспяхова. Загадзя спланаваная і добра арганізаваная праца дазволіла звесці да мінімуму ўсе пытанні і праблемы, якія ўзнікалі ў гэты напружаны час. Прыёмная кампанія ясна паказала, што кожны супрацоўнік БДУ вельмі добра ўсведамляе велізарную важнасць той работы, якую праводзіць прыёмная камісія. Усе службы БДУ прыярытэтнымі лічылі пытанні арганізацыі прыёму. Па першай просьбе кожны гатовы быў прыйсці на дапамогу і прыкласці ўсе намаганні для хутчэйшага вырашэння задачы. Невыпадкова Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам уступных экзаменаў сёлета не зрабіла на працу прыёмнай камісіі ніводнай заўвагі.

Яшчэ не зроблены ўсе справаздачы па прыёме на першы курс у гэтым годзе, а ўжо Міністэрства адукацыі распачало працу над правіламі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, якія плануецца зрабіць стабільнымі на пяць, а то і болей гадоў. Гэта значна аблегчыць працу прыёмных камісій і дазволіць абітурыентам раней вызначацца з абраннем будучай спецыяльнасці і пачынаць рыхтавацца да ўступных выпрабаванняў.

Трэба сказаць словы падзякі ўсім, хто прымаў удзел у арганізацыі і правядзенні ўступных экзаменаў. Усе працавалі сумленна, і нашыя намаганні не былі дарэмнымі. Мы ўпэўнены, што ў БДУ паступілі найлепшыя. Жадаем новым студэнтам поспехаў у навучанні і спадзяемся, што яны будуць з годнасцю несці высокае званне студэнта БДУ.

**А.І. ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**адказны сакратар**
**прыёмнай камісіі БДУ**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## НАВУКОВЫ ФОРУМ У ТУРЦЫІ

Паміж БДУ і Тэхнаполісам Блізкаўсходняга тэхнічнага універсітэта ў рамках міжнароднай выставы навукова-даследчай прадукцыі і інавацыйных праектаў, што адбылася **15—16 верасня** ў сталіцы Турцыі — Анкары, падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве. Згодна з гэтым дакументам, абедзве ВНУ будуць ажыццяўляць сумесныя праекты ў галіне праграміравання, геаінфармацыйных тэхналогій і біятэхналогій.

Акрамя таго, БДУ падпісаў шэраг пагадненняў з турэцкімі фірмамі, якія зацікавіліся распрацоўкамі нашых навукоўцаў: тэхналогіямі ачысткі вады, абароны інфармацыі, экспрэс-кантролю на наяўнасць наркатычных рэчываў, маніторынгу навакольнага асяроддзя і г.д.

## РАСПРАЦОЎКІ ПАЕДУЦЬ НА ВЫСТАВЫ

У сямі міжнародных выставах прыме ўдзел БДУ на мяжы верасня і кастрычніка.

У Нацыянальнай выставе Беларусі, што праходзіць у сталіцы Лівана Бейруце **з 27 верасня па 1 кастрычніка**, наш універсітэт прадставіць лазернае абсталяванне, прадукцыю малатаннажнай хіміі, камплекты тэстаў для вызначэння наркатычных і псіхатропных рэчываў, праўдзівасці прадуктаў харчавання жывёльнага паходжання, сокаў і вінаматэрыялаў, харчовыя ўзбагачальныя дабаўкі для хлебабулачных вырабаў і г.д.

Амаль такі ж пералік распрацовак БДУ павязе ў Вільнюс: **3—7 кастрычніка** там адбудзецца Нацыянальная выстава нашай краіны. Сярод навінак, якія ўпершыню будуць паказаны на экспазіцыі БДУ, варта назваць ветэрынарны прэпарат для лячэння і прафілактыкі мікраэлементозаў жывёлаў.

Актыўна рыхтуецца універсітэт і да паездкі ў Санкт-Пецярбург: там **5—7 кастрычніка** пройдзе міжнародная выстава "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі". БДУ збіраецца ўдзельнічаць у конкурсе інавацыйных распрацовак з шасцю распрацоўкамі: тэхналогіямі і абсталяваннем для стэрылізацыі, тэхналогіямі мікрахвалевай апрацоўкі насення, біяпалівам, спірометрам, узбагачальнымі харчовымі дабаўкамі і інш.

Свае распрацоўкі наш універсітэт пакажа і на трох выставах, што пачнуць працаваць **4 кастрычніка** ў Мінску — "Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра — 2005", "Медыцына — 2005", "Лясны рэсурс у Беларусі".

Здабыткі ў адукацыйнай сферы нашага універсітэта можна будзе ўбачыць **28 верасня — 1 кастрычніка** ў Маскве на міждзяржаўнай выставе "СНД: Адукацыя—2005". БДУ пазнаёміць наведнікаў з электроннымі падручнікамі, сістэмай дыстанцыйнага навучання, навучальнымі прыладамі, вучэбна-лабараторнымі практыкумамі і комплексамі, аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмай.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АКЦЫІ

# БУДАТРАДЫ БУДУЮЦЬ НОВАЕ ГРАМАДСТВА

*Студэнты — народ вясёлы: адпачываць, лежачы на канапе, — не для іх. Студэнты БДУ не выключэнне: кожны год тысячы студэнтаў вядучай ВНУ краіны ўдзельнічаюць у праграме "Працоўнае лета" — ідэальны варыянт для тых, хто хоча і папрацаваць, і адпачыць. Унесці сваю лепту ў сямейны бюджэт на працягу года студэнтам не дазваляе вучоба, а летам магчымасцей зарабіць грошы значна больш. Удвая больш прыемна працаваць на карысць інтэрната, універсітэта і ўсёй дзяржавы ў кампаніі сваіх аднагодкаў.*

## "БУДУЕМ СВОЙ ДОМ СВАІМІ РУКАМІ"

Пад такім дэвізам дзейнічаюць студэнцкія рабочыя атрады БДУ па добраўпарадкаванні і падрыхтоўцы да новага навучальнага года універсітэцкіх інтэрнатаў. Фарміраваннем атрадаў штогод займаецца студгарадок БДУ.

Гэтым летам іншагародніх студэнты, якія жывуць у інтэрнатах БДУ і не лянуюцца сваімі рукамі ўладкоўваць сваё жыллё, утварылі студэнцкія рабочыя атрады (100 чалавек у ліпені і 101 чалавек у жніўні). Студэнцкія брыгады працавалі ва ўсіх 10 інтэрнатах БДУ: фарбавалі вокны, дзверы, рамантавалі мэблю, абклейвалі шпалерамі сцены. Не засталіся без увагі і прылеглыя тэрыторыі.

## АД ДОМА — ДА ДЗЯРЖАВЫ

Для працавітых студэнтаў былі прадугледжаны і больш маштабныя праекты, карысць ад якіх — для ўсёй дзяржавы: рэканструкцыя Аўгустоўскага канала (у складзе зводнага атрада Мінскага гарадскога камітэта ГА "БРСМ"), будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі. Арганізацыяй праграмы "Працоўнае лета" займаліся не толькі грамадскія арганізацыі кшталту БРСМ і Студэнцкага саюза БДУ, але і структурныя падраздзяленні універсітэта: упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю, студэнцкі гарадок, упраўленне аховы працы і па надзвычайных сітуацыях, кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі, гістарычны факультэт, упраўленне прававо́й работы. Акрамя працы ў студатрадах, студэнцкі цэнтр занятасці БДУ дапамог працаўладкавацца на лета 150 студэнтам. Усяго ж працу ўлетку атрымалі 878 студэнтаў нашага універсітэта. Мінулым летам студэнты БДУ працавалі і ў краязнаўчым атрадзе (які праводзіў археалагічныя раскопкі ў зоне рэканструкцыі Аўгустоўскага канала), у педагагічных атрадах у спартыўна-аздараўленчым комплексе "Брыганціна", у валанцёрскім атрадзе для працы ў гарадской прыёмнай камісіі (дапамагалі абітурыентам запаўняць анкеты і заявы), атрадзе па аказанні адраснай дапамогі ветэранам. У сувязі з нядаўнім адкрыццём новага навучальнага корпуса юрыдычнага факультэта для студэнтаў з'явілася работа па перавозцы кніг, мэблі, матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання кафедраў і аўдыторый.

Добра папрацаваўшы ўлетку, студэнты заслужылі, каб іх стараннасць была заўважана і адзначана. Спецыяльна для іх 22 верасня ў кінатэатры "Цэнтральны" адбылося ўрачыстае падвядзенне вынікаў дзейнасці студатрадаў. Лепшыя будатрадаўцы атрымалі каштоўныя падарункі, граматы і ўдзячнасці. Віншавалі іх прадстаўнікі трох устаноў: роднай ВНУ, БРСМ і Мінскага гарадскога цэнтра занятасці насельніцтва. Пасля цырымоніі ўзнагароджання прагучала канцэртная праграма, падрыхтаваная творчым актывам студэнцкага гарадка БДУ, і была паказана новая маладзёжная камедыя "Марыць не шкодна!" — падарунак ад кінатэатра "Цэнтральны". БДУ супрацоўнічае з кінатэатрам ужо даўно: газета "Студенческий городок" пастаянна дае анонсы рэпертуару кінатэатра, праводзіць конкурсы на яго прызы (білеты на самыя цікавыя фільмы), у памяшканні кінатэатра "Цэнтральны" наш універсітэт праводзіць акцыі, сустрэчы.

## БУДАЎНІЦТВА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ

Заробкі студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі, вагаліся даволі сур'ёзна ў залежнасці ад відаў работ: прыборка тэрыторыі, праца ў якасці падсобных рабочых.

**Расказвае Юрый Міронаў, студэнт III курса факультэта журналістыкі БДУ:**

— Універсітэт накіраваў у будтрэст, там прыпісалі да прараба, які знаходзіў для кожнага з нас занятак. Працавалі мы ў якасці падсобных рабочых без аніякіх скідак на маладосць і "зялёнасць". Грузілі ўсё, што прывозілі: ці то граніт, ці то жалеза або цэмент. Працоўны дзень доўжыўся з 8 да 17 гадзін (з перапынкам на абед), 2 разы трэба было адзначацца. Заробак склаў каля 340 тысяч рублёў. Наш будатрад налічваў каля двух дзесяткаў студэнтаў.

## РЭКАНСТРУКЦЫЯ АЎГУСТОЎСКАГА КАНАЛА

Гэты аб'ект павінен стаць своеасаблівым шлюзам, які пры адкрыцці пусціць паток замежных турыстаў у Беларусь і пакладзе пачатак развіццю міжнароднага турызму ў нашай краіне. На Аўгустоўскім канале папрацавалі за лета 2 будатрады ад Мінска (35 чалавек у ліпені і 30 чалавек у жніўні, прычым частка першай змены засталася і на другую). Яны ачышчалі канал ад смецця, умацоўвалі берагі, добраўпарадкавалі тэрыторыю. Сярэдні іх заробак склаў 350—400 тысяч рублёў.

* * *

Нас больш за ўсё цікавіў удзел студэнтаў БДУ ў першай маладзёжнай будоўлі краіны (такі статус прысвоены рэканструкцыі Аўгустоўскага канала паводле прэзідэнцкага ўказа). На пытанні карэспандэнта "Універсітэта" адказаў **Аляксандр Лянкевіч, загадчык штаба працоўных спраў БДУ, сакратар БРСМ БДУ.**

**— З якіх факультэтаў БДУ працавалі студэнты ў будатрадах на аднаўленні Аўгустоўскага канала?**

— Былі студэнты Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, а таксама гістарычнага, фізічнага і іншых факультэтаў.

**— Ці многа было жадаючых?**

— Студэнтаў, жадаючых папрацаваць летам на Аўгустоўскім канале было многа. Схема іх прыняцця такая: яны запаўнялі заяўкі, са студэнтамі размаўлялі (бо для нас галоўны крытэрый маральнага плану: важна, каб чалавек быў добры, надзейны) і давалі ім накіраванне на медыцынскі агляд і форму, неабходную для запаўнення, у якой самым важным было ўзгадненне з дэканатам. Тыя, хто паспеў прайсці медагляд ва ўстаноўлены тэрмін і хто атрымаў згоду ад дэканата, паехалі працаваць у будатрадзе.

**— На ўрачыстай цырымоніі лепшым будатрадаўцам уручалі падарункі. Якім чынам выбіралі найлепшых?**

— Лепшымі будатрадаўцамі прызнаны тыя, хто найбольш адказна падышоў да справы, праявіў сапраўдную актыўнасць і ўмудрыўся пры гэтым не зарабіць ніякіх заўваг. Граматы і ўдзячнасці ўручаны ў розных "намінацыях": тым, хто працаваў на Аўгустоўскім канале, на будоўлі Нацыянальнай бібліятэкі, у складзе краязнаўчага атрада, валанцёрскіх атрадаў адраснай дапамогі ветэранам, хто займаўся добраўпарадкаваннем інтэрнатаў і інш. Свае падарункі ўручылі рэктар БДУ, прадстаўнікі студгарадка БДУ, БРСМ, Мінгарвыканкам.

**— Аляксандр, як вы самі ставіцеся да ідэі далучаць студэнтаў да будаўніцтва?**

— Гэта выдатная ідэя, бо студэнты праводзяць час з карысцю і для душы, і для цела. Знаходзячыся далёка ад дома, яны знаёмяцца між сабой, працуюць і весяляцца. Члены кожнага атрада перад ад'ездам склалі план мерапрыемстваў: былі прадугледжаны экскурсіі, разнастайныя конкурсы — на лепшага "байца", містэра і міс атрада, самую цікавую насценгазету.

* * *

Будатрадаўцаў запрасілі на рэканструкцыю канала Агінскага наступным летам. І ў наступным годзе новая "маладая рунь" будзе дапамагаць аднаўляць дзяржаву, а значыць, і яе грамадства. Вялікае, як вядома, пачынаецца з малога: аднаўленне дзяржавы — з працы будатрада.

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фота Аляксандра ЛЯНКЕВІЧА**



**На фотаздымку: удзельнікі студэнцкага атрада на будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі**

## АБ'ЯВЫ

**Установа адукацыі "Юрыдычны каледж Беларускага дзяржаўнага універсітэта" абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасады:**

выкладчыка кафедры агульнаправавых і грамадзянска-прававых дысцыплін.

Тэрмін падачы дакументаў — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Камсамольская, 21, аддзел кадраў, тэл. 229-29-46.**

**Навукова-даследчая ўстанова "Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А.Н. Сеўчанкі" БДУ абвяшчае конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

— малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.01 (прылады і метады эксперыментальнай фізікі) — 1;

— малодшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.03 (радыёфізіка) — 1.

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Дакументы накіроўваць на адрас: 220064, г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.**

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы" абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу кафедраў:**

— маладзёжнай палітыкі: загадчык кафедры (1), старшы выкладчык (1);

— аховы працы і заканадаўства аб працы: загадчык кафедры (1);

— філасофска-гуманітарных навук: прафесар (1);

— эканомікі і кіравання вышэйшай школы: дацэнт (1);

— псіхалогіі і педагагічнага майстэрства: дацэнт (1).

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, пакой 215, тэл. 200-91-07.**

## ПАДЗЯКА

Студэнты БДУ, якія ўлетку 2005 г. атрымалі дыплом бакалаўра па спецыяльнасці «хімік-фармацэўт», выказваюць падзяку прафесару В.П. Гаранькову, дацэнтам Г.М. Царык, У.У. Грушэўскаму, М.Я. Пархач, У.І. Сянчылу, В.В. Карпуку, Г.М. Семянковай, прафесару А.І. Хаменку. Дзякуючы ім мы атрымалі неабходныя веды і ўменні, якія зможам рэалізаваць у далейшым навучанні і рабоце.

### ПАДЗЕІ

# СВЯТА каля БЕЛАЙ ВЕЖЫ

***На пачатку верасня ўжо ў дванаццаты раз краіна святкавала Дзень беларускага пісьменства, які сёлета прайшоў у Камянцы, на Брэстчыне.***

У рамках свята 31 жніўня — 4 верасня прайшла традыцыйная Рэспубліканская навукова-творчая экспедыцыя "Дарога да святыняў", маршрут якой пралягаў па тэрыторыі Мінскай і Брэсцкай абласцей. Завяршылася шэсце каля Белай вежы, дзе і адбылося ўрачыстае адкрыццё свята. А ў Свята-Сімяонаўскай царкве ў гэты дзень адслужылі святочную літургію. Да свята было прымеркавана і правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі "Камянецкія чытанні".

Галоўным героем урачыстасці ў Камянцы стала беларуская кніга. На цэнтральнай плошчы горада адбылося свята кнігі і прэсы. Тут размясціўся павільён "Кнігі Беларусі" (100 кв. м), дзе былі прадстаўлены больш за 1000 выданняў. Працавалі і тэматычныя кніжныя пляцоўкі: "Салют, Перамога!", "Краіна ведаў", "Планета дзяцінства" і "Сінявокая Беларусь". Побач разгарнуліся экспазіцыі вядучых рэспубліканскіх перыядычных выданняў, прэсы Брэстчыны. На сцэне адбываліся прэзентацыі кніг беларускіх выдавецтваў, друкаваных сродкаў масавай інфармацыі.

У праграме свята было выступленне мастацкіх калектываў, фальклорнае свята, конкурс майстроў народнай творчасці, спартыўна-паказальныя нумары, абласны агляд-конкурс "Тэатральнае Палессе—2005", музычна-паэтычная падзея "Песня пра зубра" і святочны феерверк.

У святкаванні Дня беларускага пісьменства прынялі ўдзел найвышэйшыя службовыя асобы краіны, прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу, пісьменнікі, супрацоўнікі выдавецтваў, журналісты, навукоўцы, дзеячы культуры і мастацтва.

Па запрашэнні Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь удзел у свяце прымаў і наш універсітэт. У Камянец прыехалі выдаўцы з БДУ: начальнік упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы І.Я. Лук'янчык, загадчыкі сектараў упраўлення Н.Ф. Акуліч і Г.У. Лазоўская, а таксама прадстаўнікі аўтарскіх калектываў і аўтары выдадзеных у БДУ кніг, якія ўдзельнічалі ў прэзентацыях.

На свята пісьменства універсітэт прывёз найлепшыя кнігі. На тэматычнай кніжнай пляцоўцы "Краіна ведаў" была выстаўлена вучэбная літаратура: навучальныя дапаможнікі з грыфам Міністэрства адукацыі і аўтарскія курсы лекцый. Кнігі выдавецтва БДУ, а таксама Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецкі цэнтр БДУ" былі прадстаўлены ў павільёне "Кнігі Беларусі". Яркія вокладкі універсітэцкіх кніг прыцягвалі ўвагу, з вялікім поспехам прайшлі прэзентацыі. Прафесар кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, доктар гістарычных навук, Заслужаны работнік адукацыі Беларусі Э.М. Загарульскі расказаў пра сваю кнігу "Вішчынскі замак XII—XIII вв." Гэтая манаграфія атрымала высокую адзнаку на рэспубліканскім конкурсе "Мастацтва кнігі — 2005". Як падарунак ад БДУ яе ўручылі міністру адукацыі А.М. Радзькову.





Выдавецтвам БДУ разам з аўтарскімі калектывамі распрацавана серыя кніг "Memoria et Gloria" ("Памяць і Слава"), прысвечаная выдатным навукоўцам нашага універсітэта. Гэта даніна павагі тым, хто праславіў універсітэт і пакінуў значны след у сусветнай навуцы. Задача серыі — пазнаёміць чытача з навуковай спадчынай, педагагічнай дзейнасцю, стварыць партрэт навукоўца па ўспамінах калег і вучняў. У рамках серыі выйшлі 4 кнігі, пра якія і расказалі прадстаўнікі аўтарскіх калектываў — кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі старажытнага свету гістфака А.А. Прохараў і кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістфака М.Ф. Шумейка.

Першая кніга серыі расказвае пра доктара філалагічных і педагагічных навук, Заслужанага дзеяча навукі Беларусі А.Я.Супруна, які больш за 30 гадоў узначальваў кафедру тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства філфака БДУ. Другая кніга прысвячаецца памяці навукоўцы-антыказнаўцы, прафесара, доктара гістарычных навук Ф.М. Нячая. Яшчэ адна кніга серыі прысвечаная 60-годдзю Вялікай Перамогі, удзелу супрацоўнікаў БДУ ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. І зусім новая кніга, якая толькі што пабачыла свет, расказвае пра жыццё і дзейнасць акадэміка, навукоўцы-фізіка Ф.І. Фёдарава.

Акрамя аўтараў і выдаўцоў, БДУ быў прадстаўлены і творчым калектывам "Тутэйшая шляхта". Гэта Народны фальклорны ансамбль студэнтаў і выкладчыкаў БДУ. Яго кіраўнік Лявон Махнач — фізік-хімік, а таксама паэт, кампазітар і мастак. "Тутэйшая шляхта" — адзіны ў краіне калектыў аматараў, якія вядуць навуковую работу па фальклоры, імкнуцца адлюстраваць шляхетнасць беларускай народнай песні. Падбіраючы песні для рэпертуару, музыкі звычайна працуюць над рукапісамі, шукаюць рэдкія творы, якія нідзе не гучалі, выкарыстоўваюць песні, якія чулі ад дзядоў. У рэпертуары ансамбля ёсць і песні на словы класічнай беларускай літаратуры і на словы сучасных паэтаў (напрыклад, на словы Янкі Купалы, Паўлюка Труса, Івана Басецкага). "Тутэйшая шляхта", бадай, самы каларытны творчы калектыў універсітэта, менавіта таму музыкі і прадстаўлялі БДУ на Дні беларускага пісьменства ў Камянцы. Артысты не толькі выканалі народныя песні і шляхецкія танцы, але і правялі віктарыну: задавалі пытанні пра БДУ і ўручалі пераможцам памятныя прызы з сімволікай універсітэта.

Свята скончылася, але пакінула светлыя ўражанні, дало добры імпульс на будучыню — памнажаць выданне змястоўных і карысных кніг, працягваць асветніцкую справу нашых славутых продкаў. А БДУ, годна прадстаўлены на Дні беларускага пісьменства, яшчэ раз паказаў свой вялікі творчы патэнцыял.

**Юлія ПАПОВА**
**Фота аўтара**

### У ВОЛЬНЫ ЧАС

## ЗАПРАШАЕ "ТЭАТРАЛЬНЫ КУФАР"

***З 27 верасня па 2 кастрычніка ў Мінску праходзіць II Міжнародны фестываль студэнцкай тэатральнай творчасці "Тэатральны куфар".***

Ініцыятарамі і арганізатарамі фестывалю ўжо другі год выступаюць наш універсітэт і яго студэнцкія тэатры — Народны музычна-драматычны тэатр "На філфаку" і Народны драматычны тэатр "На балконе". Паводле іх задумы, "Тэатральны куфар" павінен падтрымаць і папулярызаваць студэнцкую тэатральную творчасць, наладзіць міжнародныя сувязі паміж тэатрамі, дапамагчы тэатральным калектывам у пераймании вопыту адзін у аднаго.

Акрамя тэатраў БДУ, Беларусь сёлета на фестывалі будзе прадстаўлена тэатрамі "Залаты Арыён", "Прametэй" (БДАТУ), "Арт" (Полацк), "Пілігрым" (Полацк), "Аўтограф" (Віцебск), "Парадокс". Чакаюцца тэатральныя калектывы з Расіі, Літвы, Славеніі, Германіі і Іспаніі. Галоўным прызам, як і ў мінулым годзе, стане "Прыз глядацкіх сімпатый", які будзе ўручаны па выніках рэйтынгавага галасавання гледачоў фестывалю.

**Настасся ЮДЧЫЦ**

### ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

## САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА МОЛАДЗІ

Паважаныя першакурснікі! Сектар сацыяльнай работы ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю арганізуе аздараўленне ў санаторыі-прафілакторыі БДУ, дзе можна не толькі папраціць сваё здароўе, але і атрымаць талоны для любой сталовай БДУ на суму, якая ў 9 разоў перавышае кошт пуцёўкі; займаецца пытаннямі матэрыяльнай дапамогі студэнтам, магістрантам, аспірантам са сродкаў агульнауніверсітэцкага фонду; ажыццяўляе сацыяльную падтрымку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, дзяцей з сем'яў вайскоўцаў, што загінулі ці сталі інвалідамі пры выкананні вайсковага абавязку, кантралюе пастаноўку гэтай катэгорыі студэнтаў на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне.

**Па дадатковую інфармацыю звяртайцеся ў галоўны корпус БДУ (праспект Незалежнасці, 4), пакой 204, тэл. 209-52-75.**

**Вольга КАЗАКОВА,**
**загадчыца сектара**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

27 верасня 2005 года
Падпісана да друку 26.09.2005 г.
Зак. 819. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by